# КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 51 (1647) | 29 снежня 2023 г.



Першыя ўдзельнікі інфармацыйна-пазнавальнага праекта "Культурныя канікулы" — Дзед Мароз і Снягурка з Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту

Працяг тэмы на стар. 13

# З НОВЫМ 2024 ГОДАМ!

9 771994 478007 23051



# Па беларускім календары

**Пад якім знакам пройдзе 2024-ы? У нашай краіне — раўненне на якасць. Прэзідэнт яшчэ ў лістападзе падпісаў адпаведны ўказ. І пасыл Кіраўніка дзяржавы будзе пачуты. Доказ таму — у святочным аглядзе мінулых гадоў ды іх вектараў.**

Калі і як зарадзілася традыцыя абвяшчэння тэмы года ў нашай краіне, дакладна невядома. І пакуль іншыя медыя спрачаюцца на гэты конт, звернемся да самых надзейных крыніц — афіцыйных сайтаў Прэзідэнта Беларусі ды БелТА. Паводле іх інфармацыі, менавіта напярэдадні 1996-га, віншуючы суайчыннікаў са святам, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў аб'явіць Год згоды і стварэння.

У 2005-м Прэзідэнт, выступаючы на нарадзе па развіцці банкаўскай сістэмы, прыгадаў, што бягучыя 12 месяцаў прысвечаны павышэнню эфектыўнасці гаспадарання і эканоміі рэсурсаў. Вектар быў зададзены, але распісанай па пунктах праграмы яшчэ не існавала.

Як працэс праходзіць сёння? Тэму новага года Прэзідэнт абвяшчае ў адпаведным указе. Дакумент вызначае ўнутраную палітыку і актуальныя кірункі сацыяльнай сферы. Савет Міністраў зацвярджае рэспубліканскі план мерапрыемстваў. У рэгіёнах ствараюцца свае планы.

Такім чынам у 2006-м арганізавалі Год маці, а ў 2007-м — дзіцяці. Потым правялі Год здароўя, Год роднай зямлі, Год... якасці. Так-так, 2010-ы пераклікаецца з 2024-м. Праз колькі дзён у Беларусі пачнуць рабіць акцэнт на ўмацаванні канкурэнтаздольнасці краіны праз беражлівае і прадуманае стаўленне да рэсурсаў, рэалізацыі высокатэхналагічных і энергаёмістых праектаў, пераваге якасных паказчыкаў над колькаснымі. І мэта — далейшае павышэнне ўзроўню жыцця беларускага народа — застаецца галоўнай.

Але вернемся ў мінулае, дзе свае сляды пакінулі гады, прысвечаныя прадпрымальнасці, кнізе, беражлівасці, гасціннасці, моладзі, культуры, навуцы. Мяркуючы па публікацыях СМІ, самымі запамінальнымі былі 2018—2020-ы, што прайшлі пад знакам малой радзімы. У той перыяд нашы вёсачкі і гарады прыкметна змяніліся да лепшага.

У летапісе Беларусі таксама вылучаюцца гады, прыярытэтамі якіх сталі народнае адзінства і гістарычная памяць. Шмат зроблена і ў Год міру і стварэння. Якімі былі для галіны культуры гэтыя 365 дзён? У сённяшнім нумары мы сабралі самыя яркія імгненні 2023-га — давайце ўспомнім агульныя поспехі і дасягненні.

Працяг тэмы на стар. 4—13



## Дарагія сябры!

Артысты, музыканты, мастакі, паэты і танцоры!

Дзеячы культуры і мастацтва, што прысвяцілі таленты, розум і намаганні захаванню і распаўсюджанню беларускай культуры, нацыянальных традыцый і спадчыны!

Прыміце самыя шчырыя і цёплыя віншаванні з Новым годам і Нараджэннем Хрыстовым!

Для творчай сферы год, які сыходзіць у гісторыю, адзначаны важнымі падзеямі. Адкрыты музей у Хатыні, арганізаваны цыкл канцэртаў "Губернатарскі сад", дадзены старт марафону дыялогавых пляцовак "Разам з мастацтвам", пабачылі свет тры кінакарціны айчыннай вытворчасці. Упершыню зладжаны Расійска-беларускі музейны форум, Рэспубліканскі тэатральны фестываль "Перамога" і свята "Вераснёўскі фэст" у Жылічах, адноўлена традыцыя правядзення канцэртаў Маладзёжнага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра. Працягнулі радаваць публіку брэндавыя фестывалі "Славянскі базар у Віцебску", "Лістапад"...

Яркія прэм'еры і аншлагі, незабыўныя гастролі, гучныя канцэрты, высокія ўзнагароды — гэта ўсё тое, што напаўняла культурную палітру Года міру і стварэння.

2023-і стаў асаблівым і для Міністэрства культуры. Юбілейная дата перагарнула старонку 70-гадовага летапісу нашага ведамства.

Паважаныя калегі!

Нам па праве ёсць чым ганарыцца! І я дзякую вам за адданасць справе і энтузіязм, за важкі ўклад ва ўмацаванне нацыянальнага культурнага набытку краіны! Безумоўна, многае зроблена, але ў перспектыве чакае значна больш працы.

Я глыбока ўпэўнены, што 2024 год яшчэ мацней аб'яднае нас і адкрые маштабныя творчыя гарызонты, прынясе найвышэйшыя вынікі на прафесійным шляху!

Няхай цудоўныя зімовыя святы падораць натхненне і радасць! Няхай запаветныя мары спраўдзяцца!

Няхай Новы год будзе поўны здароўя, любові і шчасця! Усяго вам самага добрага і душэўнага!

**Міністр культуры Рэспублікі Беларусь
Анатолій Маркевіч**



# Старадаўняя традыцыя да твару маладым

**Чароўнасць таленту і юнацтва. Менавіта ў такой атмасферы прайшоў Рэспубліканскі навагодні баль для моладзі. Свята стала сапраўдным падарожжам па гісторыі музычнай і танцавальнай культуры Беларусі.**

Даўнюю традыцыю баляванняў у нашай краіне адрадзілі ў 2018-м. З таго часу пастаяннае месца правядзення навагодняга мерапрыемства — Палац Незалежнасці. Сёлета ў зал урачыстых цырымоній запрасілі больш за 330 юнакоў і дзяўчат з розных рэгіёнаў краіны. Гэта выдатнікі, пераможцы навуковых, творчых, спартыўных конкурсаў, актывісты. Поруч са студэнтамі — кадэты, выхаванцы Мінскага суворааўскага ваеннага вучылішча.

Сярод ганаровых гасцей — Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч, намеснік Прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, міністры культуры і адукацыі Анатолій Маркевіч і Андрэй Іванец, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі і кіраўнік грамадска-кансультатыўнага савета па пытаннях адукацыі Ігар Карпенка. У ролі распарадчыка выступіў народны артыст Беларусі Уладзімір Громаў.

Усіх прысутных цёпла павітаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка:

— Надышоў той адзіны дзень у годзе, калі наш Палац Незалежнасці кардынальна змяняе аблічча. Літаральна некалькі гадзін таму ў кабінетах і залах гэтага будынка вырашаліся важныя пытанні палітыкі, эканомікі, бяспекі. Цяпер тут пануе атмасфера музыкі і танца. Атмасфера маладосці.

Звяртаючыся да прыгожых, шчаслівых маладых людзей, Кіраўнік дзяржавы з удзячнасцю прыгадаў тых, хто іх выгадаваў. Менавіта бацькі і настаўнікі "прывялі" юнакоў і дзяўчат у Палац Незалежнасці — навучылі ставіць правільныя мэты, дабівацца поспеху.

— Усё, што ў вас цяпер ёсць, — ад іх. А вось з заўтрашняга дня вы пачняце пісаць сваю гісторыю ўжо ўласнай рукой — на аснове таго, што вам прынеслі і паднеслі бацькі. Не забывайце пра гэта. Трэба паважаць тых, хто зрабіў вас сёння такімі, — даў наказ моладзі Прэзідэнт і падкрэсліў: — Хочаце вы ці не, але будучыня ў вашых руках.

Традыцыйна баль адкрыўся паланэзам дэбютантаў. Прадоўжыў праграму вальс, за якім была полька. Таксама юнакі і дзяўчаты з задавальненнем выканалі кадрылю, мазурку, галоп, шакон. Прытрымліваючыся старадаўніх звычаяў, класічную частку завяршылі "Паўночнай кадрыляй", да якой далучыліся ўсе ўдзельнікі ўрачыстасці. Пасля юнакоў і дзяўчат чакалі сучасныя танцы: рок-н-рол, мамба, бугі-вугі, ламбада, твіст ды іншыя.

Па словах маладых гасцей, такі чароўны вечар назаўсёды захаваецца ў іх сэрцах. Тым больш што Кіраўнік дзяржавы паклапаціўся аб прыемных сувенірах: па распараджэнні Прэзідэнта для ўдзельнікаў балю падрыхтавалі відэа і фота на памяць.







# У адпаведнасці з законам

**У прэс-клубе "Культура і мастацтва" 20 снежня адбылася відэаканферэнцыя на тэму "Закон № 305-З: дзеянне ў супрацьдзеянні (інфармаванне, прапаганда, тлумачэнне ў фарміраванні нецярпімага стаўлення да карупцыі ў сферы культуры)".**

Як паведаміла начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры **Таццяна Стволава**, у ведамстве зацверджаны план па супрацьдзеянні карупцыі на 2022—2025 гады. Ён прадугледжвае захады, што ахопліваюць кадравую работу, вытворчую і гаспадарчую дзейнасць, і адукацыйна-выхаваўчыя, інфармацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы.

### КРЫМІНАГЕННЫЯ РЫЗЫКІ

Старшы пракурор упраўлення Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь **Андрэй Федаровічаў** нагадаў, што ў другім паўгоддзі органы пракуратуры праверылі выкананне заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй і супрацьдзеянні экстрэмізму ў сферы культуры. Цягам 2020—2023 гадоў выяўлена 53 карупцыйныя злачынствы, за якія прыцягнута да адказнасці 18 работнікаў галіны. Пераважная колькасць злачынстваў была звязана з перавышэннем службовых паўнамоцтваў, крадзяжом і атрыманнем хабару. Найбольшыя крыміногенныя рызыкі звязаны з арганізацыяй і правядзеннем культурна-масавых мерапрыемстваў, працаўладкаваннем блізкіх сваякоў і дакладнасцю ўліку рабочага часу.

Выклікае пытанні таксама ўзяцце абавязацельстваў у дзяржаўных службовых асоб. Выяўлены выпадкі, калі кадравыя службы не рабілі гэтага. Здаралася, што абавязацельствы браліся ў тых асоб, у якіх не павінны былі. Часам у абавязацельствах пэўных супрацоўнікаў неабгрунтавана прапісвалася забарона на выкананне іншай работы за плату.

Таксама шмат нюансаў ва ўрэгуляванні канфлікту інтарэсаў, які ўзнікае з-за працы ў адной установе сваякоў ці сужэнцаў. Дзякуючы такому інструменту фінансавага кантролю, як дэклараванне даходаў і маёмасці службовых асоб, былі выяўлены факты неўказання ў дэкларацыях аб'ектаў нерухомасці, аўтамабіляў, даходаў ад продажу падобнай маёмасці. Ёсць парушэнні, звязаныя з бязвыплатнай спонсарскай дапамогай. У шэрагу выпадкаў гэтыя сродкі выкарыстоўваліся не на тыя мэты, на якія вылучаліся, альбо наогул на тыя, што забаронены законам. Таксама Андрэй Федаровічаў звярнуў увагу, што ў некаторых арганізацыях камісіі па супрацьдзеянні карупцыі падыходзяць да працы фармальна.

### СУРОВЫЯ САНКЦЫІ

Вывучалася мэтавае выкарыстанне бюджэтных сродкаў. Міністэрства фінансаў за згаданы перыяд правяло 147 праверак. У выніку выяўлены парушэнні бюджэтнага заканадаўства, звязаныя з утрыманнем у штаце тэхнічнага персаналу і ўстанаўленнем разнастайных надбавак ды прэмій. Актуальнае і пытанне закупак. Здараецца, што яны праводзяцца з адной крыніцы. Часам пераможцам тэндара абвяшчаецца ўдзельнік, прапанова якога не адпавядае патрабаванням тэхнічнай дакументацыі аб закупцы.

Старшы аператыўны ўпаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю Міністэрства ўнутраных спраў **Арцём Ляшкевіч** нагадаў, што ў залежнасці ад наступстваў карупцыйных правапарушэнняў у Рэспубліцы Беларусь устаноўлена крымінальная, адміністратыўная, дысцыплінарная і грамадзянска-прававая адказнасць. Крымінальны кодэкс прадугледжвае суровыя санкцыі, якія дасягаюць тэрміну ў 15 гадоў зняволення з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права працаваць на пэўных пасадах альбо займацца вызначанай дзейнасцю. Міністэрства ўнутраных спраў разам з Генеральнай пракуратурай, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ды Міністэрствам адукацыі падрыхтавала памятку па прадухіленні і ўрэгуляванні канфлікту інтарэсаў.



Іна Лаўкова, Андрэй Федаровічаў, Таццяна Стволава і Арцём Ляшкевіч

## Важна ведаць

Таксама госці студыі адказалі на актуальныя пытанні па тэме, якія паступілі ад гледачоў відэаканферэнцыі.

**— Уявім сітуацыю: загадчык бібліятэкі ў аграгарадку з нейкіх прычын узяў яшчэ і палову стаўкі прыбіральшчыка памяшканняў альбо дворніка. Ці мае ён такое права?**

— Калі гэта загадчык сектара ці філіяла, а не самастойнай арганізацыі, то мае.

**— Колькі асоб могуць быць членамі камісіі па супрацьдзеянні карупцыі, калі ў калектыве не больш за 20 чалавек?**

— У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў — не менш за пяць. Гэта не азначае, што ў такой арганізацыі камісія абавязкова павінна быць створана, але калі яна ўжо ёсць, то мусіць адпавядаць патрабаванням.

**— Калі зафіксавана, што тэндар на пастаўку прадукцыі або на аказанне пэўнай паслугі адбыўся, ці можа кіраўнік яго адмяніць і перадаць тое права іншаму прэтэндэнту? Ці расцэньваецца гэта як нагода для падазрэння ў карупцыі?**

— Калі працэдура закупкі можа быць адменена ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое яе рэгулюе, кіраўнік мае такое права. Але калі падставы для адмены надуманыя, гэта звычайна відавочна. На падобны выпадак звернуць увагу праваахоўныя органы.

**— Работнікі збіраюць грошы на падарунак начальніку да дня нараджэння. Кіраўнік не ведае аб гэтым. Падарунак каштуе больш за дазволеную суму, а ўручаецца на працоўным месцы. Як трэба паступіць?**

— З 1 сакавіка істотна змянілася заканадаўства па гэтым пытанні. Агульнае правіла такое: падарунак, кошт якога не перавышае 20 базавых велічынь, не парушае Закон "Аб барацьбе з карупцыяй" пры ўмове, што ўручаны падчас афіцыйнага мерапрыемства. Кошт падарунка большы за названую суму — кіраўнік мусіць заявіць аб тым ва ўстаноўленым парадку. Калі падарунак уручаецца ад калектыву, сітуацыя нармальная, а вось калі падносіцца асобным супрацоўнікам — гэта можа разглядацца як карупцыя.

**Антон РУДАК**

# Новыя этапы будаўніцтва

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 26 снежня.

Дзякуючы відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Разглядаўся ход будаўніча-мантажных работ у канцэртнай зале "Віцебск" і планы іх заканчэння да XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар". Сума, вылучаная на працы сёлета, склала 20 мільёнаў 360 тысяч рублёў. За гэтыя сродкі рэканструяваны лесвіцы, абліцаваны гранітам фасады, добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя, устаноўлены малыя архітэктурныя формы, заменены вітражы, на галоўным фасадзе змантыраваны інфармацыйны святлодыёдны экран. У планах — перабудова памяшканняў і аўтастаянкі, а таксама закупка светлавога, гукавога і ліфтавага абсталявання. Мяркуецца, што Дзяржаўная інвестыцыйная праграма на 2024 год прадугледзіць выдзяленне яшчэ 24 мільёнаў рублёў.

Таксама абмяркоўвалася замена сістэмы дастаўкі кніг "Тэпеліфт" у Нацыянальнай бібліятэцы. Апаратура агульнай вартасцю 6 мільёнаў 700 тысяч рублёў мусіць быць прывезена ў Беларусь да канца красавіка, а ў маі пачнецца мантаж.

Юбілеі 2023-га

70 гадоў
Міністэрству культуры
Рэспублікі Беларусь



Пастаўскія цымбалы



Аплецены посуд з Віцебшчыны

# Скарбонка традыцый

**У Год міру і стварэння адмыслоўцы Міністэрства культуры і падначаленых яму ўстаноў актыўна працавалі над захаваннем нематэрыяльнай спадчыны.**

У сакавіку ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей быў уключаны элемент **“Традыцыйны роспіс на шкле”**, пашыраны ў Бярозаўскім і Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці. Асноўная тэматыка твораў — жывёльны і раслінны свет, казачныя сюжэты. Роспіс па шкле дадаваў у інтэр’ер народнага жылля гучны мажорны акцэнт, пераклікаўся з роспісам на куфрах, дыванах, пабеленых сценах печаў, з тканымі і вышыванымі ўзорамі.

Таксама ў рэестр трапіла **тэхналогія ткацтва “кажушком”** (Маларыцкі раён). Спрадвеку ткацтва было адным са штодзённых заняткаў жанчын, якія забяспечвалі сям’ю неабходным адзеннем, абрадавымі і ўжытковымі тканінамі. У вёсках з ільну і воўны стваралі розных гатункаў матэрыю, кужэльныя наміткі, вясельныя ручнікі, уціральнікі, настольнікі, посцілкі-радзюжкі. Сёння ў раёне восем майстрых, якія перанялі тэхналогію і з’яўляюцца носьбітамі звычаю.

У маі статус нематэрыяльнай каштоўнасці атрымала **культура беларускай дуды**. Гэты народны інструмент належыць да тыпу язычковых духавых. Дуда выкарыстоўвалася для музычнага суправаджэння танцаў, песень і прыпевак на сямейных і каляндарна-абрадавых святах, вечарынах і кірмашах. Сёння зафіксаваны звесткі аб 30 носьбітах і пераемніках традыцыі, якія знаходзяцца ў Беларусі.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей у жніўні папоўніўся элементам **“Традыцыйнае інструментальнае выкананне на дыятанічных цымбалах”**, што бытуе ў Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці. Дыятанічныя цымбалы — аўтэнтычны музычны інструмент з найбольш старажытным выглядам. Яны маюць гукарад, што адпавядае беларускай народнай музыцы і дазваляе выконваць творы толькі ў адной або дзвюх дыятанічных гамах.

У лістападзе ў рэестр дадалі элемент **“Калядная зорка Случчыны”**, які захаваўся ў аграгарадку Лучнікі і вёсках Бранавічы ды Варкавічы Слуцкага раёна. З даўніх часоў у Лучніках да Калядаў рыхтуюць вялікую, да 1,5 метра ў дыяметры, 16-ражковую зорку, што замацоўваецца на доўгім дрэўку. Са “звяздой”, як называюць



Традыцыйны роспіс па шкле

прадмет у рэгіёне, мясцовыя жыхары абыходзяць двары ўвечары 13 студзеня. Прыняць яе лічыцца гонарам. Зорка дорыць упэўненасць, што наступны год акажацца для сям’і спрыяльным.

А ў снежні было вырашана надаць статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці **тэхналогіі аплятання бяростай ганчарнага посуду**. Звычай сустракаецца ў Віцебскай вобласці. Характэрная для гэтага рэгіёна ёмістая, масіўная кераміка вызначаецца архаічнай суровасцю, што згладжваецца і ажыўляецца касым або спіральным узорам з залацістых стужак бяросты. Ён пакрывае пасудзіны ад донца да венчыка.



► Галоўная ёлка краіны ля Палаца Рэспублікі



◄ Убранне лялек — узор маларыцкага ткацтва

 Перформанс “Навагодні вернісаж” праходзіць у Мінску ў Верхнім горадзе штодзень да 2 студзеня.





Палац у Свяцку



▲ Інтэр'еры палаца ў Жылічах

# Вяртанне да жыцця

**Вялікая ўвага надавалася сёлета і ахове помнікаў архітэктуры.**

З 2023 года ў заканадаўстве аб культуры, аб распараджэнні маёмасцю і ў падатковым заканадаўстве замацаваны нормы, накіраваныя на ўдасканаленне працы з руінаванымі аб’ектамі, спрашчэнне парадку работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, парадку дзяржаўнай рэгістрацыі і продажу руінаваных і пашкоджаных аб’ектаў, а таксама на ўстанаўленне падатковых ільгот уласнікам помнікаў.

Яшчэ адно новаўвядзенне — мясцовыя органы атрымліваюць паўнамоцтвы фарміраваць рэгіянальныя комплексы мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках рэалізацыі дзяржаўных праграм.

Сярод найбольш знакавых аб’ектаў, здадзеных у эксплуатацыю ў 2023 годзе, — першы пускавы комплекс **палацава-паркавага ансамбля ў Свяцку** Гродзенскага раёна. Архітэктурную перліну, якая мае рысы ранняга класіцызму, узвялі ў 1779-м паводле праекта Джузэпэ Сака з Вероны на заказ прадстаўнікоў магнацкага роду Валовічаў. Са студзеня 2017-га праходзіла рэканструкцыя з частковай рэстаўрацыяй будынкаў палацава-паркавага ансамбля пад шматфункцыянальны аздараўленчы комплекс. У выніку было цалкам адноўлена знешняе аблічча помніка, завершаны ўнутраныя работы ў флігелях і галерэях.

Таксама ўвялі ў эксплуатацыю другую і трэцюю чэргі **палацава-паркавага ансамбля ў Жылічах** на Кіраўшчыне. Ён адносіцца да позняга класіцызму і быў пабудаваны архітэктарам Каралем Падчашынскім на замову бабруйскага павятовага маршалка Ігната Булгака ў 1830-я. Пасля рэвалюцыі тут размяшчаўся дзіцячы дом, у 1930-х — зоатэхнічны тэхнікум, пасля Вялікай Айчыннай вайны — Бабруйская трохгадовая аграномічная школа. Рэстаўрацыя комплексу пачалася ў 2009 годзе. На сёння адноўлена заходняя частка палаца, флігель, усе гістарычныя інтэр’еры ў галоўным корпусе і аранжарэя, разбураная ў гады Другой сусветнай. Цяпер у помніку архітэктуры знаходзяцца Жыліцкі гістарычны комплекс-музей і дзіцячая школа мастацтваў.

Завершаны работы ў капліцы, што ў вёсцы Дубае на Піншчыне. Уключаны ў турыстычны абарот будынак па праспекце Скарыны, 3, у Полацку і руіны царквы ў аграгарадку Леніна Добрушскага раёна. Працы ажыццяўляліся за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, уласных сродкаў і іншых крыніц.

Таксама сёлета праводзіліся рамонт, рэстаўрацыя і тэхнічнае абслугоўванне сотняў гісторыка-культурных каштоўнасцей: Старога замка ў Гродне, мемарыяльнага комплексу “Хатынь”, параднага ўвахода ў сталічны Цэнтральны дзіцячы парк, комплексу будынкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску і Любавіцкай сінагогі ў Віцебску.

Працягваюцца маштабныя работы ў Гальшанскім, Крэўскім, Навагрудскім, Ружанскім замках, у храмах Полацка, Нясвіжа, Жыровічаў і ў капліцы на тэрыторыі Закозеля Драгічынскага раёна.

Спадчыну захоўвае
Антон РУДАК



Палац у Жылічах

Юбілеі 2023-га



30 гадоў
Нацыянальнаму
гісторыка-культурнаму
музею-запаведніку
"Нясвіж"



Валерый Шмат,
спявак, кампазітар,
заслужаны артыст
Рэспублікі Беларусь,
лідар арт-гурта
"Беларусы":

— Шчыра віншую чытачоў “Культуры” і нашу Бацькаўшчыну з Новым годам! Жадаю заставацца культурнымі людзьмі ў песнях, словах, учынках, нават у думках. Здароўя, дастатку, Божага благаслаўлення ва ўсіх добрых справах!

 Дзяржаўнай ахове помнікаў Беларусі споўнілася 100 гадоў.

Юбілеі 2023-га



80 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Пташука, кінарэжысёра,народнага артыста БССР



Кадр з фільма "Кіношнікі"



На здымках карціны "Казбек"

# Пажынаем і памнажаем

**Да запаветных "пяці хвілін" застаецца зусім трохі, таму — час падвесці вынікі года. Якімі былі мінулыя 365 дзён для беларускага кінематографа? Спойлер: надзвычай плённымі.**

## ГУЧНЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ 2023 ГОДА

Сёлета на студыі "Беларусьфільм" было створана багата праектаў розных маштабаў. Мы дакрануліся да незямных прастораў са стужкай "Сусвет Івана Міско", якая распавядае пра касмічнага скульптара, завяршылі прыгоды з героямі мультфільма "Тошка і яго сябры" і пагрузіліся ў чараўніцтва з маладымі беларускімі аніматарамі ў "Зімовым калейдаскопе". Аднак самыя яркія прэм'еры чакалі нас у кінатэатрах.

У красавіку, да Дня медыцынскага работніка, на экраны выйшаў фільм Аляксандра Яфрэмава **"Ліст чакання"**. Карціна прысвечана медыкам, што на першае месца ставяць не асабістыя выгады, а здароўе пацыентаў. Стужка стала своеасаблівым адказам на рэаліі і сацыяльныя змены, з якімі мы сутыкаемся сёння. У цэнтры — выпрабаванне выбарам: з'ехаць за мяжу ў пошуках вялікіх грошай або застацца ў краіне, дзе тваё майстэрства запатрабавана суайчыннікамі? "Ліст чакання" — гісторыя пра сучасных беларусаў, нічым не падфарбаваная і тым каштоўная.

Верасень запомніўся прэм'ерай нацыянальнага праекта **"На другім беразе"**, які стаў адным з самых касавых фільмаў айчыннай кінастудыі, сабраўшы больш за 726 тысяч беларускіх рублёў ужо падчас другога пракатнага тыдня. Выхад карціны на вялікія экраны прымеркавалі да Дня народнага адзінства: сюжэт адпавядаў нагодзе. У аснове гісторыі — лёс двух братоў-беларусаў Паўла і Антона Смолічаў. Старэйшы, Антон, — партызан, што змагаецца з польскімі захопнікамі і ўсімі сіламі спрабуе паўплываць на Паўла, які займае нейтральную пазіцыю. Аднак калі малодшы брат сутыкаецца з бязлітаснасцю польскіх акупантаў, яго светапогляд змяняецца. А знаёмства з савецкай разведчыцай Алесяй прымушае хлопца задумацца аб вечных каштоўнасцях, блізкіх людзях і Радзіме, падзеленай мяжой.

Сапраўдны падарунак для беларускай публікі напярэдадні свят — доўгачаканая лірычная камедыя **"Кіношнікі"**. Гэта першы за шмат гадоў айчынны іграва фільм на фестывалі "Лістапад". Праект не толькі прадстаўляў нашу краіну ў межах конкурсу "Кіно маладых", але і быў карцінай адкрыцця творчага форуму. Стужка Кірыла Халецкага, нядаўняга выпускніка Акадэміі мастацтваў, шмат у чым аўтабіяграфічная. Сюжэт знаёміць з маладым рэжысёрам Колем, які прыходзіць на кінастудыю па размеркаванні. Каб зняць свой фільм, герой павінен пераадолець шэраг выпрабаванняў.

"Кіношнікі" працягваюць падарожжа па краіне. Калі вы яшчэ не патрапілі на самую цёплую стужку гэтага года — трэба падарыць сабе квіток у кіно. У 2024-м таксама будзе што паглядзець: "Беларусьфільм" рыхтуе шэраг гучных прэм'ер.



Ялінка ля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі




Кадр са стужкі "На другім беразе"



Выстава "Адметныя 85" да юбілею Беларускага саюза мастакоў працуе ў НББ да 20 лютага.





Кадр з фільма "Ліст чакання"



Пачатак здымак стужкі "Чорны замак"

Юбілеі 2023-га



85 гадоў з дня нараджэння Зінаіды Зубковай, актрысы, народнай артысткі Беларусі

# Да сустрэчы на экранах

## У ЧАКАННІ НОВЫХ СТУЖАК

Год, які адыходзіць, для беларускіх кінематаграфістаў быў багаты не толькі на завершаныя праекты. Налета нас чакаюць не менш відовішчныя і цікавыя карціны, вытворчасць якіх пачалася ў 2023-м.

З першага здымачнага дня выклікае цікавасць сумесны беларуска-расійскі фільм **"Чорны замак"** па матывах рамана Уладзіміра Караткевіча "Чорны замак Альшанскі". Стужка стане новай вехай у гістарычным жанры. Гледачам абяцаюць паказаць тое, чаго даўно не было ў беларускім кіно: шмат экшэну, дынаміку і відовішчныя сцэны. Маштабы заяўлены велізарныя. Праз фільм пройдзе больш за 50 лакацый. Сярод іх гістарычныя месцы, натурныя пляцоўкі, музейныя комплексы ў Міры і Нясвіжы, а таксама руіны замкаў і тое, што, па словах рэжысёра Кірыла Кузіна, будзе за іх выдавацца. Лейтматыў кіно неразрыўна звязаны з нацыянальнай мінуўшчынай. Ідэя высокая: мы не бязродныя, бо ў нас найбагацейшая гісторыя са сваімі ліхадзеямі і героямі, прыгожымі пачуццямі, якія раскрываюць у беларусах толькі добрыя рысы. Дакрануцца да ўласнай спадчыны зможам зусім хутка. Стужка выйдзе ў красавіку 2024-га.

Айчынныя кінематаграфісты не пакінулі без увагі і ваенную тэматыку, тым больш налета мы адзначым 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Работа над фільмам з папярэдняй назвай **"Казбек"** пра партызанскі рух і аперацыю "Баграціён" сімвалічна стартавала 23 чэрвеня, калі пачалося гэтае маштабнае наступленне Чырвонай арміі. Карціну ставарае каманда аднаго з найлепшых аўтараў ваеннага жанру, які фантастычна камбінуе праўду ліхалецця і пачуцці, — рэжысёра Івана Паўлава. Яго "Падрыў" сёлета пабываў на розных міжнародных фестывалях і нават прадставіў Беларусь у Індыі на прэстыжным кінафоруме краін ШАС. Якой атрымаецца новая праца адмыслоўца — даведаемся неўзабаве.



Кадр з кіно "Казбек"

## НАПЯРЭДАДНІ КРУГЛАЙ ДАТЫ

Наступны год сапраўды ўнікальны для "Беларусьфільма", бо адзначаны векавым юбілеем нацыянальнага кіно. На працягу 2024-га нас чакае яшчэ больш яркіх праектаў, новых імёнаў і гісторый пра мэтраў, якія стаялі ля вытокаў айчыннага кінематографа. Таму зычым нашым творцам поспехаў, а публіцы — прыемных уражанняў!

Давайце глядзець беларускае!

**Кінапрагляд правяла Яўгенія ГАБЕЦ**



### Кірыл Халецкі, рэжысёр-пастаноўшчык:

— Сёлета са мной здарылася шмат прыемных падзей, за якімі стаіць вялікая праца: я зняў дэбютную поўнаметражную карціну "Кіношнікі", будучы штатным рэжысёрам Нацыянальнай студыі "Беларусьфільм". Камусьці здаецца, што нам, стваральнікам стужкі, проста пашанцавала, але зрабіць кіно — гэта справа, якая патрабуе эмацыйнай і фізічнай аддачы. Вельмі радасна, што фільм ужо ў беларускім пракаце і любы глядач можа акунуцца ў сусвет "Кіношнікаў"! Калі гаварыць пра асабістае, то я адважыўся на адказны крок і прапанаваў руку і сэрца каханай дзяўчыне Юліі. Вясной наступнага года мы пажэнімся!

На 2024-ы планы грандыёзныя, бо я падымаю планку. Па-першае, хачу стаць найлепшым мужам! Па-другое, прыступіць да работы над яшчэ адным поўнаметражным фільмам. Таксама збіраюся прапрацоўваць свае аўтарскія задумы, рыхтавацца да пітчынгаў.

Віншую ўсіх чытачоў газеты "Культура" з Новым годам! Жадаю простага чалавечага шчасця! Няхай здараецца як мага больш добрага, а дрэнныя моманты не псуюць настрой, таму што побач з вамі блізкія і родныя людзі, якія зробяць ярчэйшым нават самы пахмурны дзень! 2024-ы — гэта год Цмока, таму зычу вашаму ўнутранаму дракону менш нервавацца і часцей адпачываць! Любіце і будзьце любімымі. А падчас свят зазірніце ў кінатэатр, каб ацаніць наш фільм!



Традыцыйная калядная экспазіцыя "Анёльскія спаткані" даступная ў Гродне да 10 студзеня.

Юбілеі 2023-га



95 гадоў з дня нараджэння Гаўрыіла Вашчанкі, народнага мастака БССР



Ялінка, якая сустракае гасцей Беларускай дзяржаўнай філармоніі

# Чым 2023-і парадаваў моладзь?

**Падводзячы вынікі года ў рубрыцы "Максіма маладых", успомнім самыя гучныя імёны. Які плён нашым героям прынёс 2023-і? Чаго чакаюць ад 2024-га? Чытайце да канца, бо ў кожным віншаванні — рэцэпт поспеху!**



**Элеанора Качалоўская, 23 гады, міс Беларусь:**

— У 2023-м было багата незабыўных момантаў — пачынаючы ад атрымання звання міс Беларусь на рэспубліканскім конкурсе і першай віцэ-міс на "Міс Еўропа Кантыненталь", завяршаючы маленькімі перамогамі: новыя знаёмствы, сустрэчы, удзел у сацыяльных праектах, добрае самаадчуванне ўсіх блізкіх. Надалей у мяне таксама грандыёзныя мэты, але як атрымаецца? Свет непрадказальны.

Хачу пажадаць кожнаму з вас марыць! Моцнага здароўя, сіл і энергіі. Няхай сонечных дзён у роднай Беларусі будзе больш, а хмурных людзей менш! Зычу, каб 2024-ы стаў такім жа яркім, як успышкі навагодніх феерверкаў, такім жа прыгожым, як ёлка, такім жа вясёлым, як смех дзіцяці!



**Анастасія Чадзій, 25 гадоў, мастачка, член Беларускага саюза мастакоў:**

— У 2023-м я паўдзельнічала ў 13 праектах, сярод якіх міжнародны конкурс "Свет вачыма мастака" (Санкт-Пецярбург, Расія), арт-сімпозіум (Татарстан), праект "Сцяна" ў Гродзенскай выставачнай зале ды іншыя. У рамках апошняга ў мяне прайшла персанальная выстава. Маю творчасць высока ацанілі на міжнароднай арэне: я двойчы стала прызёрам. У наступным годзе планую развіваць навыкі і працаваць з новымі тэхнікамі. Таксама трэба будзе прэзентаваць дыпломны праект у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Я працягну актыўна ўдзельнічаць у выставах і здзіўляць прыхільнікаў сваёй творчасці.

Хацелася б пажадаць, каб кожны з вас дзяліўся прыемнымі словамі і рабіў добрыя ўчынкі. Няхай жыццё афарбуецца ў яркія колеры! Не забывайце заўважаць прыгажосць навакольнага свету і шукайце ў кожным дні нагоду для радасці!



**Кацярына Шакорда, 23 гады, акардэаністка:**

— Для мяне самымі значнымі падзеямі 2023-га сталі канцэрты ў Вялікім тэатры Беларусі да Дня Незалежнасці, у Палацы спорту (выступленне на "Міс Беларусь"), у Доме Масквы, сольнік у Магілёўскім каледжы мастацтваў. І, вядома ж, перамога нашага з Марынай Федосенка дуэта на Міжнародным конкурсе-фестывалі баяністаў і акардэаністаў "Прыз Санкт-Пецярбурга".

Налета хацелася б яшчэ больш прысвяціць сябе выканальніцтву. У планах шмат праектаў: актыўны ўдзел у творчых спаборніцтвах, канцэрты ў розных гарадах Беларусі і за яе межамі. Наперадзе апошні курс у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, разлічваю паступіць у магістратуру.

Напярэдадні цудоўнага свята ад усёй душы віншую вас з Новым годам! Няхай ён стане шчаслівым, будзе напоўнены радаснымі падзеямі і дасягненнямі! Цмок — сімвал мудрасці, дык няхай жа 2024-ы пачнецца з правільных рашэнняў, якія прывядуць да вяршыні поспеху. Міру, любові і гармоніі!



**Анастасія Краўчанка, 19 гадоў, фіналістка шоу "Х-Фактар. Беларусь":**

— За гэты год я выступіла ў многіх гарадах краіны, а таксама прэзентавала творчасць на такіх маштабных мерапрыемствах, як "Песня года Беларусі", "Славянскі базар", адкрыццё II Гульняў краін СНД, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2023", "Новая песня года" ў Маскве, фінал шоу "Залятай у трэнды". Ганаруся, што ў 2023-м выпусціла пяць песень! Дарэчы, кампазіцыя "Рамонкі" атрымала плацінавую сертыфікацыю. І ўсё гэта дзякуючы вам, любімыя слухачы!

Новы год — новая старонка жыцця. Дык няхай на ёй не будзе пустога месца, няхай яна запоўніцца мноствам фарбаў, яркіх падзей і прыгод! Няхай вам спадарожнічае поспех і дастатак! Атрымлівайце асалоду ад кожнага імгнення жыцця, будзьце з любімымі, атачайце сябе і блізкіх цяплом і клопатам, а яны ў адказ сагрэюць вас!



**Юлія Лазоўская, 22 гады, актрыса:**

— Гэты год парадаваў мяне дзвюма яркімі падзеямі: выпускам з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і афіцыйным працаўладкаваннем у Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, а таксама ўдзелам у сямі пастаноўках.

У 2024-м планую запоўніць прабелы па асабліва важных справах. Напрыклад, мяне ўвялі ў вакальныя спектаклі, таму буду ўпарта працаваць над голасам.

Але ж новы год — гэта не толькі новыя задачы, але і новыя магчымасці. Дарагія чытачы, няхай натхненне і любоў зробяць жыццё насычаным, пазітыўным і напоўняць яго добрымі навінамі!



**Надзея Тоўсцікава, 22 гады, міс Мінск:**

— Гэты год найлепшы ў маім жыцці. Я атрымала ганаровы тытул "Міс Мінск — 2023", стала фіналісткай конкурсу "Міс Беларусь — 2023", на якім увайшла ў топ-10 і заваявала тытул "Міс топ-мадэль — 2023". І дзякуючы гэтым творчым спаборніцтвам я здабыла неверагодную ўнутраную сілу. Цяпер не баюся ніякіх выпрабаванняў, убачыла, што здольная на большае, чым думала. Я стала яшчэ мацней шанаваць родных, якія заўжды побач, якія падтрымліваюць усе мае ідэі. Стараюся як мага часцей прыязджаць да бацькоў, бачыцца з сябрамі, бо гэта мая апора.

Упэўнена, што 2024-ы акажацца не менш яркім. Я заканчваю Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Гэта будзе цікавы эпізод у маім жыцці: новыя месца працы, жыллё і асяроддзе.

Чытачам хачу пажадаць ніколі не падаць духам, радавацца кожнаму дню, праводзіць больш часу з роднымі і сябрамі. Памятайце, што ўсе цяжкасці часовыя. І галоўнае: у якім узросце вы б ні былі, не пераставайце верыць у цуд!

**Рэцэпты поспеху шукала Настасся ЮРКЕВІЧ**







# Россып віншаванняў

**На працягу ўсяго 2023-га "Культура" расказвала пра найлепшыя спеўныя, танцавальныя, інструментальныя, цыркавыя аб'яднанні Беларусі. Разам мы радаваліся іх дасягненням, прафесійнаму росту, заадно даведваліся пра творчыя навінкі з розных куткоў краіны. Кожны герой публікацый стаў па-сапраўднаму блізкім. І напярэдадні свята нашы зорачкі даслалі ў газету самыя шчырыя і цёплыя пажаданні, адрасуючы іх і рэдакцыі, і вам, дарагія чытачы.**

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны цырк імя Валерыя Абеля:**

— Вось і наступіў той чароўны навагодні час, калі кожны з нас, як дзіця, чакае цуду і верыць у яго. Дзівосы бываюць розныя, і яны штодзённа акружаюць нас: цуды робім мы — сваімі справамі, сваёй пастаяннай працай. Надыходзіць адно з самых любімых свят дарослых і дзяцей. І хаця за акном зіма, яно па-сапраўднаму цёплае. Новы год заўсёды нагадвае нам пра галоўныя каштоўнасці: любоў да родных і блізкіх, да свайго горада і краіны. Няхай для кожнага з вас 2024-ы і наступныя гады стануць часам радасці, асабістага шчасця, рэалізацыі ўсіх планаў, здзяйснення самых шчырых жаданняў! Кахання, дабра, міру і згоды ў кожны дом!

●●●

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны хор народнай песні імя В. Балаханава:**

— Зычым, каб у наступным годзе спраўдзілася ўсё добрае, каб цікавыя людзі вас не абміналі, а публікацыі радавалі і натхнялі чытачоў на новыя творчыя поспехі. Няхай ваша жыццё будзе спеўным!

●●●

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай музыкі "Явар":**

Так доўга зімы ўсе мы чакалі,
Нарэшце дзянёчкі з марозам насталі!
Срэбны іней на елках, дубах,
на бярозе...
Цудоўныя святы ўжо на парозе!
Віншуем з Новым годам,
а хутка і з Калядамі!
Жадаем ад усёй душы,
каб вы былі багатымі —
Багатымі на тэмы, натхненне і сяброў,
На новыя ідэі, падпісчыкаў і чытачоў.
Няхай у новым годзе "на раз"
усё ўдаецца,
А дрэннае і сумнае — у старым
застаецца.
Зычым, каб мірнае сонца свяціла,
Цяпла і пяшчоты на ўсіх каб хапіла!
Вашым сем'ям жадаем дзіўнай парою
Здароўя і шчасця, на сэрцы — спакою,
Каб шанцавала, здзяйснялася мара!

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорная студыя цыркавога мастацтва "Арэна":**

— Новы год — свята, якое цудоўным чынам аб'ядноўвае людзей дзякуючы агульнаму настрою, надзеі, злучае мінулае, сучаснасць і будучыню. На парозе новага года прынята азірацца, падводзіць вынікі, успамінаць усё добрае, што пакінуў мінулы. Мы з аптымізмам глядзім уперад, будуем планы. Упэўнены, што 2024-ы дазволіць прымножыць дасягненні і прынясе багата поспехаў! У святочную ноч у кожнай сям'і прагучаць самыя цёплыя пажаданні родным і блізкім. Ад душы зычым усім веры ў сябе і свае сілы, рэалізацыі самых смелых рашэнняў, адкрыцця новых гарызонтаў і дасягнення няскораных вяршынь!

●●●

**Народны інструментальны ансамбль "Бравісіма":**

— Няхай 2024 год прынясе новыя праекты і шмат натхнення. Няхай старонкі газеты будуць напоўнены займальнымі матэрыяламі з захапляльнымі гісторыямі. Жадаем творчых здзяйсненняў, яркіх публікацый, што парадуюць гледачоў, і вялікіх тыражоў!

●●●

**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца "Апельсін ПЛЮС" і лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ўзорны ансамбль танца "Апельсін" Палаца культуры ААТ "Гомсельмаш":**

— Дарагія сябры! Напярэдадні 35-годдзя нашага любімага калектыву ў "Культуры" з'явілася публікацыя. Увесь "Апельсін" дзякуе рэдакцыі за ўвагу і падтрымку. Для нас гэта вельмі прыемна і значна! Віншуем усіх супрацоўнікаў выдання з зімовымі святамі! Жадаем газеце "Культура" (і беларускай культуры наогул) поспехаў, цікавых праектаў, крэатыўных ідэй, новых адкрыццяў, новых дасягненняў і абавязкова — новых чытачоў! Сябры, старайцеся захоўваць усё найлепшае і пры гэтым смела ідзіце ў нагу з часам! Моцнага здароўя і натхнення!

**Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца "Лялечкі":**

— Самыя любімыя святы ўсіх людзей — Новы год і Каляды. Гэта час светлых надзей і радасных чаканняў, час падвядзення вынікаў, час свежых ідэй і планаў. Няхай 2024-ы стане годам яркіх прафесійных поспехаў, актыўнага стварэння, рэалізацыі самых смелых рашэнняў і дасягнення новых вяршынь! Жадаем вам і вашым блізкім моцнага здароўя, шчасця, невычэрпнай жыццёвай энергіі, міру і дабрабыту, стабільнасці і працвітання!

●●●

**Народны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль мажарэтак "Халідэй":**

— Няхай гэты пакуль непрадказальны год пачне штосьці новае і прыгожае. Няхай ён падорыць усё, пра што кожны з нас марыць, адчыніць дзверы ў цудоўны свет шчасця, усмешак, цяпла і ўтульнасці, дзе не будзе месца смутку і расчараванню. Вельмі хочацца, каб гэты год стаў для ўсіх па-сапраўднаму чароўным, паднёс столькі прыемных уражанняў і радасных момантаў, колькі пажадаем. І няхай 2024-ы акажацца незабыўным!

**Віншаванні сабрала Ганна САКАЛОВА**

Юбілеі 2023-га



100 гадоў з дня нараджэння Леаніда Шчамялёва, народнага мастака БССР



**Алена Атрашкевіч, старшыня Беларускага саюза кампазітараў:**

— Гэты год быў для Беларускага саюза кампазітараў юбілейным: нашай арганізацыі споўнілася 90. Таму ладзіліся адметныя канцэрты, гучала шмат прэм'ер. Аўтары імкнуліся адзначыць дату новымі творамі, а выканаўцы — новымі праектамі, заснаванымі на айчыннай музыцы. Эдуард Ханок, да прыкладу, правёў чараду сустрэч з моладдзю. Дзякуючы гранту Прэзідэнта, Таццяна Траццяк, оперная салістка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, разам са струнным квінтэтам "Серэнада" падрыхтавала выбітную праграму "Край прыгожых людзей". Апошнім часам у кампазітарскую суполку было прынята шмат маладых творцаў. Яны таксама ініцыявалі шэраг цікавых праектаў.

Цудоўна, што беларуская музыка гучыць не толькі ў нас, але і ў замежжы. Днямі я вярнулася з VIII Міжнароднага харавога фестывалю-конкурсу "Прадчуванне Нараджэння Хрыстова", што прайшоў у Санкт-Пецярбургу і з'яднаў 54 калектывы. Сярод выкананых твораў — партытуры Аляксея Туранкова, Ігара Лучанка, Вячаслава Пяцько, Андрэя Саўрыцкага, Ірыны Дзянісавай, а таксама мае. Старшыня журы Сяргей Якімаў арганізаваў маю творчую сустрэчу з расійскімі хормайстрамі, на якой я распавядала пра Беларускі саюз кампазітараў і нашу музыку. Я прывезла з сабой шмат харавых зборнікаў, што выходзілі ў нас, і падарыла іх Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі, калектывам з Масквы, Магнітагорска, Екацярынбурга, Цверы: гэтай спадчынай цікавяцца, адзначаюць прафесіяналізм аўтараў, яе асаблівую прыгажосць. Вельмі прыемна, што мая музычная казка "Цётухна Прастуда і Новы год" (дзіцячы мюзікл, які некалькі гадоў таму ішоў у Музычным) цяпер пастаўлена яшчэ ў Мазырскім драматычным тэатры імя Івана Мележа і — пад назвай "Хто выратуе Новы год?" — у Свярдлоўскім тэатры музычнай камедыі. Наступны год — высакосны. Але не трэба баяцца! Лепш давайце радавацца, што лёс дорыць нам дадатковы дзень, за які можна зрабіць шмат добрага. 2024-ы названы Годам якасці. Таму хачу пажадаць усім як мага больш якаснай нацыянальнай музыкі. Няхай усе будуць жывыя і здаровыя — і прыходзяць на канцэрты!



Юбілеі 2023-га



85 гадоў з дня нараджэння Барыса Герлавана, народнага мастака Беларусі



"Навагоднія прыгоды катоў на даху"



"Элементарна — Новы год"

# Прыступкі ў дарослацсць

**У Новы год — з новым спектаклем. Пад такім дэвізам рыхтаваліся да зімовых свят і школьных вакацый усе тэатры краіны.**

## НА МУЗЫЧНЫ ГУСТ

Больш за ўсё падарункаў для гледачоў, як звычайна, у Маладзёжнага тэатра эстрады. Адных толькі дзіцячых — адразу два. **“Навагоднія прыгоды катоў на даху”** напісала і паставіла мастацкі кіраўнік калектыву Уладзіслава Арцюкоўская, якая літаральна фантануе ўсё новымі сюжэтнымі прыдумкамі. А тут і прыдумляць асабліва нічога не спатрэбілася: усё змалявана з рэчаіснасці, а менавіта са штодзённага эстраднага жыццябыцця. Каты вырашылі стварыць эстрадны гурт і выправіцца на гастролі. І прадзюсар знайшоўся — пацук Барбос, скарочана Бос (у выкананні Уладзіміра Варанкова — гэткі філосаф, а не толькі крэатыўшчык). І ўсё б добра, ды шчанюк (Андрэй Кунец) таксама просіцца ў каманду. Спявае ж гэты артыст, як паслухаць, ніколькі не горш, а нават лепш за іншых! Таму пачынаюцца інтрыгі, прычым даволі дарослыя. Падобны “ўваход” у закулісную праблематыку варта толькі вітаць, бо спектакляў на музычную тэму заўжды мала — іх трэба ставіць куды больш. Але ў гэтым выпадку, здаецца, можна было абмінуць некаторыя дэталі, адразу сканцэнтраваўшы ўвагу на кастынгу, што праводзяць Дзед Мароз са Снягуркай: спектакль пазначаны 0+, яго галоўная ідэя — належыць жыць у міры і згодзе — зразумелая нават немаўлятам. А сюжэтны віток з падробленым лістом — хіба для школьнікаў. Для ўсіх жа, уключаючы дарослых, у сцэнічнай дзеі шмат інтэрактыву.



Ялінка ля Палаца спорту радуе жыхароў і гасцей сталіцы

## НА РОЗНЫ ЎЗРОСТ

Другі спектакль **“Элементарна — Новы год”** Маладзёжнага тэатра эстрады, што паказваюць у павільёне былога “БелЭкспа”, па традыцыі пастаўлены рэжысёрам калектыву Ігарам Крывулькам і названы інтэрактыўнай казкай. Шоу таксама прызначана для ўзроставай катэгорыі 0+. Размова ідзе пра чатыры стыхіі: паветра, ваду, агонь і зямлю. Ці ж не цікава? Але — для куды старэйшых хлопчыкаў і дзяўчынак. Нечаканасці ўзнікаюць і ў інтэрактыве, у цэлым даволі ўдалым. Дзеці заўзята закідваюць снежкі ў кошык, гуляюць з вялізным мячом, запускаюць папяровых птушачак, спяваюць вядомую па тэлепраграме калыханку, жвава танчаць. Але чараўніцу стала называюць Снягуркай. Бо як інакш? На пытанне пра сімвал Новага года дружна адказваюць: “Дракон!” — тым больш што і адпаведная фотазона ёсць (увогуле, арыгінальна аформленых пляцовак тут хапае). Артысты ж чакаюць іншы варыянт — ялінка. Упэўнена: цягам амаль двух тыдняў па чатыры паказы на дзень усе недарэчнасці выправяцца. А пытанне, якога ўзросту дзяцей весці на тую ці іншую імпрэзу, застаецца на сумленні бацькоў.

## НА ЛЯЛЕЧНЫ ЛАД

Што ж да сапраўдных бэбі-спектакляў, прызначаных для самых маленькіх, дык гэта **“Матылькі”** рэжысёра Яўгена Карняга на нядаўна адкрытай малой сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. Пад яе была адаптавана невялічкая рэпетыцыйная зала — і тут здарыўся цуд. Справа не ў тым, што кожны паказ разлічаны максімум на два дзясяткі гледачоў. І не ў тым, што дзятва змяшчаецца на адмыслова выробленых падушках, што нагадваюць каменне.

У спектаклі няма слоў — толькі відовішча. Але якое чароўнае! Самае цікавае, што гэта не казка, а распаведзеная на дзіцячай мове назіранняў рэальная гісторыя — пра тое, як з вусеня атрымліваецца матылёк. Пастаноўка маляўнічая, з сапраўднымі дзівосамі: і дождж з аблачынкі льецца, і кветачка на нашых вачах вырастае з зямлі (мастак — Вольга Дваравая). Глядзець на ўсё гэта можна бясконца. Спектакль вучыць дзяцей назіраць за прыродай, беражліва ставіцца да яе багаццяў. І, галоўнае, разумець ды любіць ціхую прыгажосць.



"Матылькі"

**Прэм'еры глядзела Надзея БУНЦЭВІЧ**



Канцэрт “Калядны падарунак” адбудзецца ў Вялікім тэатры Беларусі 30 снежня.





# На вакацыях — з “Культурай”

**У нашым Telegram-канале праходзіць інфармацыйна-пазнавальны праект “Культурныя канікулы”, які мы ладзім сумесна з Міністэрствам культуры. Першым свае мерапрыемствы ансансаваў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, дзе ў снежні адкрылася хатка Дзеда Мароза. Цікавыя імпрэзы для школьнікаў падрыхтавалі ўстановы па ўсёй краіне. “К” сабрала самыя яскравыя падзеі святочных тыдняў.**

Навагодняй прэм’ерай спектакля “Залаты ключык” праводзяць 2023-і ў **Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа**. Юныя гледачы могуць не толькі далучыцца да прыгод Бураціна, але і паўдзельнічаць у святочнай імпрэзе каля ёлкі.

●●●

У **Белдзяржфілармоніі** да 7 студзеня паказваюць мюзікл “Папялушка. Навагодняя фантазія” Дзяржаўнага ансамбля танца. Маляўнічае прадстаўленне падыдзе дзецям і іх бацькам.

●●●

**Магілёўскі абласны драматычны тэатр** падрыхтаваў пастаноўкі “Снежная каралева” і “Карлік Нос”. Перад Новым годам творчы калектыў прапануе пагрузіцца ў казачны свет Кая і Герды, а з 2 па 7 студзеня — выправіцца ў музычную вандроўку і ўбачыць дзіўную гісторыю ператварэння хлопчыка Якаба ў карліка Носа.

●●●

У **Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку “Нясвіж”** з 2 па 6 студзеня запланаваны “Модны праменад” і канцэрт “Калядны джаз”. Акрамя таго, юных гледачоў чакае прэм’ера музычнага спектакля “Крыштальны чаравічак” з удзелам салістаў Белдзяржфілармоніі.

●●●

**Нацыянальны мастацкі музей** 4 студзеня правядзе майстар-клас па анімацыі ў межах праекта “Інклюзіўныя майстэрні ў Мастацкім” і па пляценні паясоў, а таксама інтэрактыўную праграму “Каляднымі сцежкамі”.

●●●

У **культурным цэнтры “Фестывальны”** ў Гродне працуе традыцыйная калядная выстава “Анёльскія спатканні”. Убачыць работы вучняў мясцовай дзіцячай мастацкай школы можна да 10 студзеня.

●●●

**Беларускі тэатр “Лялька”** ў Віцебску прэзентаваў пастаноўку “Дзівосныя прыгоды” з танцавальна-забаўляльнай праграмай “Па слядах Дзеда Мароза”. Імпрэзы даступныя да 14 студзеня.

●●●

Багата святочных мерапрыемстваў правядуць у **Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны**. Да 14 студзеня для юных наведвальнікаў будзе працаваць прастора “Музей для дзяцей” з майстар-класамі, інтэрактыўнымі зонамі і атракцыёнам віртуальнай рэальнасці.

●●●

У **Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры** да 21 студзеня хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць паўдзельнічаць у інтэрактыўна-пазнавальнай праграме “Калядныя цуды”. Госці даведаюцца, чаму ў гадавым коле народных свят Каляды займалі першае месца, як варажылі, што за песні выконвалі і якія стравы з гэтай нагоды гатавалі нашы продкі. Пазнаёміцца дзятва і з абрадавымі гульнямі.

●●●

**Гомельскі палацава-паркавы ансамбль** запрашае на экскурсіі з інтэрактыўнымі элементамі і майстар-класамі “Навагоднія гісторыі ў палацы”. Акрамя таго, убачыць старадаўнія ёлачныя ўпрыгожанні можна на выставе “Навагоднія цацкі, свечкі і хлапушкі...”.

**Канікулы планавала Ульяна КАСЦЮНІНА**

Юбілеі 2023-га



110 гадоў з дня нараджэння Віталя Цвіркі, народнага мастака БССР



Алег Елісеенкаў, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь:

— Для мяне самай запамінальнай падзеяй 2023 года стала мая творчая вечарына “Добрыя людзі” на XXII Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. На гэтым канцэрце не было топавых выканальніцкіх імёнаў (так склалася, што ў прапанаваную арганізатарамі дату многія, з кім я супрацоўнічаю, ужо былі заняты на іншых мерапрыемствах). Дарэчы, у той жа дзень а 15-й гадзіне на форуме ладзілася мая творчая сустрэча. Ці захоча публіка двойчы запар слухаць Елісеенкава? Але людзі адразу раскупілі квіткі, абедзве залы — што называецца, бітком. Я быў вельмі ўсцешаны: прыгожа аформленая пляцоўка, добры сцэнарый, маладыя спевакі, многія — выхадцы з Маладзечна. Мне самому было цікава, як жа яны выканаюць тыя кампазіцыі, што ўжо сталі візітоўкамі іншых артыстаў. І ўсё атрымалася! Публіка здымала выступленні на смартфоны, тут жа выкладвала ў Сеціва. І падпявала! Гэта было прыкметна нават па тых запісах: чалавек здымае нумар і адначасова спявае сам — не прафесійна, а “па-застольнаму”, сабе на радасць. А як мяне ўзрушыла атмасфера за кулісамі! Артысты, што рыхтаваліся да выхаду ці, наадварот, ужо выступілі, спявалі разам з тымі, хто быў на сцэне. І ў кожным адчувалася нейкая радасць. Я шчаслівы, калі здолеў падарыць яе сваёй музыкай! Вельмі важна — радавацца, усміхацца нават самым простым рэчам. Таму хачу пажадаць, каб людзі не страчвалі гэтае ўменне, каб у новым годзе ў душы, у доме ва ўсіх панаваў мір, каб на тварах расцвіталі ўсмешкі!



Больш культурных навін — у нашым Telegram-канале @kultinfa:










## Ганна Трубяцкая, спявачка:

— Я зычу ўсім безумоўнага шчасця. Такога, якога кожны хоча сам. Няхай 2024-ы прынясе шмат радасці, добрых навін! Няхай жаданні, што мы загадаем у навагоднюю ноч, абавязкова спраўдзяцца! Усім мірнага неба над галавой, а яшчэ — моцнага здароўя. Слухайце прыгожую музыку, чытайце якасныя газеты і няхай у вас усё будзе добра!




УНП 100235472



Навагодняя пошта Генерала Мароза для дзяцей працуе ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны.



# Дарагія сябры, прыхільнікі цудоўных відаў мастацтва — оперы і балета!



У светлыя дні Новага года і Нараджэння Хрыстова прыміце самыя шчырыя пажаданні здароўя, шчасця, кахання, дабрабыту, міру і спакою!

Мы ўдзячныя за тое, што ўвесь год вы былі з намі, — за поўныя залы, за ўвагу, кветкі, апладысменты і воклічы "Брава!" нашым артыстам. Спадзяёмся, мы здолелі падарыць самае галоўнае — адчуванне цуду і захапленне ад сустрэчы з сапраўдным мастацтвам. Мяркуем і ў новым годзе радаваць вас прэм'ерамі і ўжо любімымі пастаноўкамі.

Вельмі хацелася б, каб пасля кожнага паказу, а асабліва — у навагоднюю пару, вы вярталіся дадому і прыносілі з сабой толькі самыя светлыя і цёплыя пачуцці. Таму што менавіта для вас артысты кожны дзень выходзяць на сцэну Вялікага тэатра Беларусі.

2023 год быў багаты на цікавыя і разнастайныя падзеі: мы падрыхтавалі яскравыя прэм'еры, правялі традыцыйныя творчыя праекты і заснавалі новыя звычаі. Напрыклад, з вялікім поспехам упершыню на нашай сцэне прайшлі спектаклі ў межах "Гастрольнага лета ў Вялікім". Публіка ўбачыла займальныя пастаноўкі Чэлябінскага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя М. І. Глінкі і Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра класічнага балета імя Н. Касаткінай і У. Васілёва. А восенню адбыліся маштабныя гастролі Вялікага тэатра Расіі. На працягу тыдня знаны калектыў гасцяваў на нашай сцэне і прадстаўляў свае гістарычныя спектаклі "Царская нявеста" і "Іван Грозны". 2023-і аказаўся багатым і на гастролі творчых калектываў Вялікага тэатра Беларусі: балетная трупа выступіла ў Ташкенце і ў шэрагу буйных гарадоў Расіі, аркестр разам з вядучымі салістамі оперы — у Кітаі.

Спадзяёмся, што ў 2024 годзе таксама зможам парадаваць прыхільнікаў. Да студзеня, на стары Новы год, ужо рыхтуем канцэрт-сюрпрыз, а таксама баль — у новым фармаце. Нас чакаюць і прэм'еры, і традыцыйны праект "Балетнае лета ў Вялікім": у чэрвені зоркі тэатра зноў прыедуць у Нясвіж, каб некалькі дзён радаваць публіку ў замку Радзівілаў. У будучым годзе мы працягнем супрацоўніцтва з вядомымі тэатральнымі калектывамі. Ужо вясной чакаем на нашай сцэне трупу Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра балета імя Б. Эйфмана. Парад найлепшых спектакляў ад запрошаных калектываў прадоўжыць ужо другое "Гастрольнае лета ў Вялікім". І, канешне, у найбліжэйшы час стартуе падрыхтоўка да чарговага Каляднага опернага форуму.

Як бачыце, мы ў пастаянным руху і творчым пошуку. І наколькі прыемна, што ва ўсіх нашых пачынаннях побач — вы, дарагія гледачы!

Жадаем вам незабыўных уражанняў ад сустрэч з цудоўнымі мастацтвамі оперы і балета! Спадзяёмся, той, хто сёння ўпершыню пераступіў парог Вялікага тэатра Беларусі, стане нашым верным сябрам на доўгія гады. А іначай і не атрымаецца, бо мы ўпэўнены: толькі ў Вялікім тэатры і можна паверыць у казку і чараўніцтва!..

Шчаслівых свят!

**Кацярына Дулава, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар**

УНП 191081322



# Паважаныя нашы гледачы, аматары, прыхільнікі тэатральнага мастацтва!

Калектыў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з вялікай радасцю і ад усёй душы віншуе вас з Новым годам і Калядамі! Мы вельмі ўдзячныя, што вы знаходзіліся побач увесь гэты год, што наведвалі спектаклі, падзялялі з намі тыя эмоцыі, якія мы ўкладалі ў кожную пастаноўку, захапляліся і былі нашай пуцяводнай зоркай!

Жадаем, каб 2024-ы прайшоў пад знакам шчасця і дабрабыту. Няхай новы год прынясе шмат яскравых імгненняў, запамінальных падзей, адкрыццяў, цёплыя ўзаемаадносіны. Гармоніі і спакою ў вашы душы і міру ў вашы дамы!

Няхай жыццё будзе насычана момантамі, якія натхняюць, надаюць энергію, дапамагаюць рухацца наперад! Тэатральнае мастацтва валодае чароўнай сілай духоўнага ўзбагачэння, і Купалаўскі тэатр жадае кожнаму з вас у любым узросце захоўваць адчуванне ўсхваляванага чакання цудаў перад пачаткам нашых спектакляў і перапоўненасці пасля іх заканчэння!

Будзьце здаровыя, будзьце побач з намі, бо мы працуем для вас! Вы нашы купалаўцы!

УНП 100377901

# Афіша

## з 29 снежня па 5 студзеня

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава "**Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм**". **Да 10 студзеня.**
- Выстава "**Нашы калекцыі. Французскае выяўленчае мастацтва са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь**". **Да 15 студзеня.**
- Выстава "**Іван Ахрэмчык. Майстар. Людзі. Эпоха**", прысвечаная творчасці народнага мастака БССР Івана Восіпавіча Ахрэмчыка (1903–1971). **Да 21 студзеня.**
- Выстава "**Апалінарый Гараўскі. Да 190-годдзя з дня нараджэння**". **Да 28 студзеня.**
- Выстава "**«...На гонар і на хвалу Госпаду Богу...». Датаваныя і падпісныя творы сакральнага мастацтва Беларусі XVI–XIX стст.**". **Да 28 студзеня.**
- Выстава жывапісу народнага мастака Беларусі Гаўрыіла Харытонавіча Вашчанкі (1928–2014) "**Палескі волат**", прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння творцы. **Да 4 лютага.**
- Экскурсіі: "**Самыя-самыя...**" **(6+)**, "**Якога колеру зіма?**" **(6+)**, "**Казкі Усходу**" **(10+)**, "**Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма**" **(10+)**, "**Партрэты даўнія мінулых пакаленняў...**" **(10+)**, "**Пяць моў кахання**" **(16+)**, "**Жаночы партрэт**" **(16+)**, "**Мінск у музеі**" **(16+)**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычная праграма "**Раство ў Ваньковічаў**" з майстар-класам па вырабе навагодніх цацак. **Да 13 студзеня.**
- Выстава мастака Наталлі Піскуновіч "**Думкі ўслых**". **Да 16 студзеня.**
- Экскурсія "**Шлях мастака Валенція Ваньковіча**". Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Зборная інтэрактыўная праграма "**Мова веера**". **Праводзіцца заўсёды.**
- Праграма "**У свяцілішчы, дзе дыхае цень алівы**". **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца,
вул. Іванаўская, 17б,
тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава майстра па бісерапляценні Веры Уладзіміраўны Занкевіч "**Па матывах ткацтва**". У экспазіцыі прадстаўлены ўпрыгожанні з некалькіх калекцый, распрацаваных у перыяд дзейнасці аўтара – з 2003 па 2023 год. **Да 18 лютага.**
- Выстава з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Майстар-клас "**Саломапляценне**". **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас "**Лялька-мотанка**". **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас "**Ткацтва**". **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium "**Зразумелае мастацтва**". **Праводзіцца заўсёды.**
- Выставачны праект "**Край белых буслоў. Вобраз Радзімы ў творах беларускіх мастакоў XX–XXI стст.**". **Да 4 сакавіка.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800

УНП 100377771



Вашы прапановы ды ідэі чакаем на e-mail: kim@kultura-info.by.



## МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Музычная казка **"Снежная каралева" (6+)**. **29 снежня ў 14.00; 30 снежня ў 11.00, 14.00; 31 снежня ў 11.00.**
• Мюзікл **"Карлік Нос" (6+)**. Прэм'ера. **2 студзеня ў 11.00, 14.00; 3 студзеня ў 11.00, 14.00; 4 студзеня ў 11.00, 14.00; 5 студзеня ў 11.00, 14.00; 6 студзеня ў 11.00, 14.00.**
• Памылка доступу ў 1 дзеі **"Гэта ўсё яна" (18+)**. **5 студзеня ў 18.30.**
• Пастаноўка "замест ліста" ў 1 дзеі **"Лілічка" (16+)**. **6 студзеня ў 18.30.**

УНП 700184039



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Спектакль **"Казка аб мёртвай царэўне" (6+)**. Прэм'ера. Галоўная сцэна. **29 снежня ў 11.30, 30 снежня ў 11.30, 31 снежня ў 11.30, 3 студзеня ў 11.30, 4 студзеня ў 11.30, 5 студзеня ў 11.30, 6 студзеня ў 11.30.**
• Трагіфарс **Donna sola ("Жанчына адна") (18+)**. Камерная сцэна. **29 снежня ў 19.00, 5 студзеня ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+)**. Камінная зала. **29 снежня ў 19.00, 5 студзеня ў 19.00.**
• **Венскі навагодні канцэрт (0+)** у выкананні аркестра **"Мінск-класік"**. Галоўная сцэна. **30 снежня ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы. Роднае" (0+)**. Камінная зала. **3 студзеня ў 19.00.**
• Спектакль **"Двор майго дзяцінства" (6+)**. Прэм'ера. Камерная сцэна. **4 студзеня ў 19.00.**
• Драма **"А досвіткі тут ціхія" (12+)**. Галоўная сцэна. Прэм'ера. **6 студзеня ў 19.00.**

УНП 100377901



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Опера ў 2 дзеях **"Гісторыя Кая і Герды" ("Снежная каралева") (6+)**. **29 снежня ў 19.00, 30 снежня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Тры парасяці" (0+)**. **29 снежня ў 12.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Шчаўкунок" (6+)**. **30 снежня ў 18.00, 5 студзеня ў 19.00, 6 студзеня ў 18.00.**
• Канцэрт **"Калядны падарунак" (12+)**. Музыка Беларусі XVI—XIX стагоддзяў. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **30 снежня ў 18.30.**
• **Навагодні канцэрт (12+). 31 снежня ў 19.00.**
• Аперэта ў 3 дзеях **"Лятучая мыш" (12+)**. **4 студзеня ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Пінокія" (6+)**. **5 студзеня ў 12.00, 6 студзеня ў 11.00.**
• Канцэрт **"Тэнары. Tribute" (12+)**. **5 студзеня ў 19.30.**

УНП 191081322



## ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Навагодні спектакль у 1 дзеі **"Дзівосныя прыгоды" (3+)** і танцавальна-забаўляльная праграма **"Па слядах Дзеда Мароза"**. **29 снежня ў 11.00, 14.00, 17.30; 30 снежня ў 11.00, 14.00, 17.30; 31 снежня ў 11.00; 2 студзеня ў 11.00, 14.00, 17.00; 3 студзеня ў 14.00, 17.30; 4 студзеня ў 11.00, 17.30; 5 студзеня ў 15.00.**

УНП 300001869

*

**Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь**

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

### Палацавы ансамбль

• Акцыя **"Навагодняя сюрпрызы"**:
– бясплатная дзіцячая творчая пляцоўка **"Навагодняя майстэрня" (0+)** у Тэатральнай зале і тэматычная фотазона – **з 1 да 4 студзеня**;
– культурнае мерапрыемства **"Модны праменад" (0+)** – **з 2 да 4 студзеня**;
– канцэртныя праграмы **"Калядны джаз" (6+)** – **5 студзеня ў 15.00, 17.00**;
– дзіцячы музычны спектакль **"Крыштальны чаравічак" (0+)** – **6 студзеня ў 13.00, 15.00.**
• Выстава **"Упершыню экспанат. 3 фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаная 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 9 студзеня.**
• Часовая экспазіцыя Вольгі Старасцінай **"Звяжам свет прыгажосцю"**. Калекцыйная зала "Нумізматыка і фалерыстыка". **Да 21 студзеня.**
• Выстава сучаснага скульптара Максіма Петруля **"4х4"**. **Да 16 лютага.**
• Часовая экспазіцыя **"Пертвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**. **Да 13 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **"Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені"**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. **У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Пертвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**, **"Нясвіж – здабытак сусветнай культуры"**, **"Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа"**, **"Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

### Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)

• Часовая экспазіцыя Андрэя Ждановіча **"Беларускі пейзаж"**. **Да 31 студзеня.**

### Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)

**Пастаянныя экспазіцыі**
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст."**.
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі"**.
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **"Культура часу"**. 3 фондаў музея-запаведніка.

**Мерапрыемствы**
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт"**, **"Карта сямі каралеўстваў"**, **"Музейны дэтэктыў"**, **"Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у кнігіні"**, **"Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).
Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава памяці мастака Уладзіміра Лукашыка **"Пераадоленне"**. **Да 11 студзеня.**
• Персанальная выстава Вадзіма Качана **"Ад піктарыялізму да канцэптуалізму"**. **Да 11 студзеня.**
• Выставачны праект **"Падарожжы Фёдара Конюхава"**. **Да 28 студзеня.**

УНП 192543414



## ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: **vitebsk-fil.by**

• **"РАМАН З ПЕСНЯЙ" (6+)** – дэбютны сольны канцэрт артыста філармоніі барытона **ВІКТАРА ЯНЧАНКІ**. **5 студзеня ў 19.00.**
• Вечар нацыянальнага мастацтва **"ПРЫЙШЛА КАЛЯДА – АДЧЫНЯЙ ВАРАТА!" (6+)**: ансамбль танца, музыкі і песні **"ТАЛАКА"**. **6 студзеня ў 19.00.**
• **"ШЧАЎКУНОК І СВЯТА РАСТВА" (6+)** – калядны канцэрт арганнай музыкі для ўсёй сям'і. **7 студзеня ў 12.00.**
• Новая імпрэза ў межах цыкла лекцый-канцэртаў **AD LIBITUM**, прысвечаная **ЯРАСЛАВУ ЕЎДАКІМАВУ (6+)**. **11 студзеня ў 19.00.**
• **"НА КРАІ КАХАННЯ" (6+)** – сольны канцэрт **ДЖУЛІЕТЫ ТАРАХЧАН**. **12 студзеня ў 19.00.**
• **"СТАРЫ НОВЫ ГОД У ФІЛАРМОНІІ" (6+)** – святочная праграма ад салістаў і калектываў філармоніі. **13 студзеня ў 19.00.**

УНП 300149385



## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая выстава **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі.
• Запрашаем усіх ахвотных **да 7 студзеня** правесці час ва ўтульнай атмасферы нашага музея! Акуніцеся ў чараўніцтва навагодніх свят, наведаўшы ўнікальныя экспазіцыі і цікавыя заняткі. Падчас зімовых канікул у прасторы **"Музей для дзяцей"** будуць даступныя:
– **майстар-клас па стварэнні навагодніх паштовак**,
– інтэрактыўная зона **"Ёлка жаданняў"**,
– атракцыён віртуальнай рэальнасці **"Танкавы бой"**,
– зона з **навагоднімі настольнымі гульнямі і размалёўкамі**.
• Выстава ёлачных рэтраўпрыгожанняў **"Гісторыя ў навагодніх цацках"** з прыватнай калекцыі Наталлі Анатольеўны Кавалёвай. У гэтай экспазіцыі вы зможаце ўбачыць і ацаніць непаўторныя шкляныя шары, ватныя і падставачныя фігуры, чароўныя калядных анёлаў і казачных герояў ручной работы. Акрамя таго, будуць прадстаўлены ўпрыгожанні часоў Вялікай Айчыннай вайны. **Да 14 студзеня.**
• Часовая экспазіцыя **"Партызан. Воін. Настаўнік"**. Да 95-годдзя з дня нараджэння беларускага жывапісца, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, прафесара Івана Нікіфаравіча Стасевіча. 3-і паверх, галерэя мастацтваў. **Да 29 студзеня.**
• Квэсты – гэта ўнікальнае пазнавальнае і захапляльнае падарожжа па музейных залах для арганізаваных груп наведвальнікаў (да 20 чалавек).
Усяго прапануецца тры квэсты:
– **"Шлях да Перамогі"** для ўдзельнікаў ад 12 гадоў,
– **"Сумка з чырвоным крыжам"** для ўдзельнікаў ад 14 гадоў,
– **"Франтавы дзённік"** для ўдзельнікаў да 12 гадоў.
• Праграма **"Франтавы Новы год"**, у рамках якой наведвальнікі апынуцца ў атмасферы 1941—1945-га. Імпрэза пагрузіць у зімовыя святочныя дні падчас Вялікай Айчыннай вайны, калі атрымаць франтавую пасылку і віншаванне ад блізкіх было значнай падзеяй для кожнага салдата. Філіял музея ВГК "Старая мяжа". **Да 13 студзеня.**

Падрабязнасці на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472



## ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **"Погляд у мінулае: мода, стыль і прыгажосць" (0+)**. Прадметы побыту, мэбля, мужчынскія і жаночыя аксесуары прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства XIX – пачатку XX стагоддзяў. Слановая зала. **Да 25 лютага.**
• **Дзіцячы калядны баль.** Для дам і кавалераў ад 6 да 12 гадоў. **6 студзеня ў 12.00.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Квэст-экскурсія для ўсёй сям'і **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**, **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**, **"Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**, **"Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541


2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: **kultura-info.by**
E-mail: **kim@kultura-info.by**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАЎРЫШ.

Агляндальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Даніїл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.
Рэдактар мастацкі — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 28.12.2023 у 16.00. Замова № 2847. Наклад 3318.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2023.